Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-10-19

**Ва ўніверсітэце адбылася II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Маніторынг навакольнага асяроддзя", прымеркаваная да Года экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя ў СНД і 20-годдзя Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя.**

# З увагай да навакольнага асяроддзя

Адкрываючы канферэнцыю, першы прарэктар універсітэта Г.М.Сендзер звярнула ўвагу на вялікае значэнне навукова-даследчай дзейнасці ў захаванні навакольнага асяроддзя і пажадала ўдзельнікам плённай работы ў вырашэнні пастаўленых задач. У сваю чаргу старшыня Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Т.А.Ялкоўская падкрэсліла ролю ўніверсітэтаў у экалагічнай адукацыі і выхаванні моладзі.

На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі навукоўцы з Цэнтра геафізічнага маніторынгу і Палескага аграрна-экалагічнага інстытута НАН Беларусі, БрДУ імя А.С.Пушкіна, Паморскай акадэміі Слупска (Польшча) і Атлантычнага аддзялення інстытута акіяналогіі імя П.П.Ширшова РАН (Калінінград, Расія). Тэмы дакладаў былі самыя разнастайныя: "Сейсмалагічныя назіранні ў структуры геафізічнага маніторынгу Беларусі", "Вынікі рэгіянальнага маніторынгу колькасці птушак паўднёва-заходняй Беларусі", "Ландшафтная абумоўленасць рызыкі ўзнікнення надзвычайных сітуацый, звязаных з моцным ветрам", "Сучасныя падыходы ў біяманіторынгу і фітарэмідыяцыі забруджаных глебы", "Тэарэтычныя асновы і прыкладныя аспекты рэалізацыі метадаў біяіндыкацыі карбанатных ландшафтаў Беларускага Палесся" і "Шматгадовая дынаміка нераставаральных атмасферных аэразольных часціц, якія паступаюць з ападкамі ў берагавую зону паўднёва-ўсходняй Балтыкі".

Пасля пленарнага пасяджэння работа канферэнцыі працягнулася ў секцыях, дзе былі абмеркаваны 66 дакладаў. У канферэнцыі ўдзельнічалі навукоўцы Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы.

**Падрыхтаваў Сяргей ГРЫШКЕВІЧ.**

Сяргей Грышкевіч. З увагай да навакольнага асяроддзя